Справы бібліятэчныя

# ВАБЯЦЬ НЕ ТОЛЬКІ КНІГІ...

***Добра, калі ў тваім пасёлку ёсць такое месца, дзе адчуваеш сябе ўтульна, можаш пагартаць цікавую кніжку, прагледзець газеты і часопісы, пазнаёміцца з культурай і нават навучыцца рабіць нешта сваімі рукамі. У пасёлку Ждановічы такім месцам з'яўляецца сельская бібліятэка.***

## *КРЫХУ ГІСТОРЫІ*

Заснавана яна ў 1950 годзе пры сельскім Савеце. Яе кніжны фонд у той час складаўся са 100 экземпляраў. Першым загадчыкам быў У.І. Качарэўскі. У 1952 годзе яго змяніў Сцяпан Пятровіч Герман. Так-што можна з упэўненасцю сцвярджаць, што бібліятэчную справу ў Ждановічах распачалі менавіта мужчыны. Ужо праз год стары будынак мясцовага органа ўлады быў разбураны і адміністрацыя перабралася ў дом па вуліцы Лінейнай, якая адбудоўвалася ўздоўж чыгункі. Тут зноў знайшла прытулак бібліятэка, загадчыцай якой стала Соф'я Іванаўна Ягела. Пакойчык у 7 квадратных метраў адыгрываў для жыхароў пасёлка вялікую культурную ролю. Кніг ужо налічвалася 1200 экземпляраў, адчувалася цеснага. Умовы крыху палепшыліся, калі ў 1964 годзе бібліятэку перавялі ў памяшканне плошчай 14 квадратных метраў, на другі паверх будынка. Бібліятэкар М.У. Каляга прывяла кнігі ў сістэму. Аднак і гэтага памяшкання было недастаткова, бо людзі прыходзілі, каб тут папрацаваць над кнігай. І ў 1971 годзе сельскі Савет узяў у арэнду два пакоі ў падвальным памяшканні пяціпавярховага кааператыўнага дома для сельскай бібліятэкі. Стала, вядома, больш прасторна, з'явіліся новыя выданні, але падвал — зусім не тое месца, дзе можна стварыць умовы для захавання кніг. Пасля шматлікіх просьбаў у 1992 годдзе бібліятэка пераязджае ў будынак па вуліцы Лінейнай. Загадчыцы Галіне Уладзіміраўне Атрасевіч стала дапамагаць Валянціна Пятроўна Слесарава, якая працуе тут бібліятэкарам з 1989 года.

## *ДОБРЫ КУЛЬТУРНЫ АЧАГ*

Цяпер у нашай бібліятэцы можна знайсці ўсё: і займальную літаратуру, і апошнія навіны, і школьныя дапаможнікі, і інфармацыю з розных галін навукі. Літаратура ахоплівае розныя тэмы, кожны можа знайсці для сябе нешта незвычайнае, карыснае. Адкрыць перад чытачом захапляючы свет кнігі заўсёды дапамагаюць — Галіна Уладзіміраўна і Валянціна Пятроўна. Усе кнігі імі разбіты на секцыі. Самыя вялікія з іх "Беларуская проза", "Руская проза", "Вершы народаў свету", "Прыродазнаўчыя навукі" і г.д. Вельмі шмат тут і даведачнай літаратуры: энцыклапедыі, слоўнікі. Ёсць і спецыяльныя аддзелы для дашкольнікаў. Цэлая паліца адведзена пад перыядычны друк: выпісваецца 15 найменняў часопісаў і 14 — газет.

Ёсць і свой краязнаўчы куток. Тут сабраны кнігі пра Ждановічы і дзе пішацца ці ўпамінаецца пра яго гісторыю, людзей і іх лёсы, прыродныя і культурныя помнікі.

## *ТВОРЧАСЦЬ НАШЫХ ЖЫХАРОЎ*

Цудоўны ў бібліятэцы інтэр'ер. Сцены ўпрыгожваюць пано і партрэты знакамітых людзей Беларусі. Пакоі выглядаюць больш утульнымі ад прысутнасці ў іх акварыумных рыбак і папугая. Насценныя стэнды ўпрыгожваюць ручнікі, сурвэткі, кашулі, фартушкі, хусткі, паясы, вышытыя мясцовымі майстрыхамі.

Акрамя таго, у бібліятэцы працуе гурток "Кніжная лячэбніца". Дзеці вучацца не толькі рамантаваць кнігі, але і любіць іх. А ў гуртку "Скіндачка" можна навучыцца вышываць сурвэткі, слуцкія паясы.

Наведваюць бібліятэку 1722 чытачы, пачынаючы ад дашкалят і пачаткоўцаў, і завяршаючы сталымі людзьмі. Перыядычныя выданні паступаюць з Цэнтральнай раённай бібліятэкі. Кніжны фонд, які папаўняецца штогод, вельмі разнастайны і цікавы. Шмат мастацкай літаратуры. Таму жыхары Ждановіч з задавальненнем прыходзяць у бібліятэку.

**Ксенія КАДОЛ.**
**п. Ждановічы.**

Наша жыцце. - 1998. - 5 мая